МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# АДАПТАЦИЯ К ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ КАК ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРОБЛЕМА: МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ОСНОВАНИЯ, ПУТИ И СПОСОБЫ РЕШЕНИЯ

**В 3 частях**
**Часть 1**

Репозиторий БарГУ

Барановичи
2003

УДК 371.13(043.2)
ББК 74р
А28

**Редакционная коллегия:** Л.Ф. Мирзаянова (главный редактор), Е.И. Бородина, Ю.В. Маслов, Е.И. Пономарева, И.В. Вакульчик, Н.М. Сотник

**Рецензенты:** доктор психологических наук, профессор, действительный член БелАО Л.А. Кандыбович; доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер

**Адаптация к профессиональной деятельности как**
**А28 психолого-педагогическая проблема: методологические основания, пути и способы решения:** Материалы II Межд. науч.-практ. конф. В 3 ч. Ч. 1 / Редкол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.) и др.– Барановичи: БГВПК, 2003.– 346 с.

ISBN 985-6616-33-6
ISBN 985-6616-34-4 (Часть 1).

В сборнике содержатся статьи участников II Международной научно-практической конференции "Адаптация к профессиональной деятельности как психолого-педагогическая проблема: методологические основания, пути и способы решения". В статьях отражено современное состояние проблемы, дано методолого-теоретическое и практическое обоснование путей и средств ее решения на современном этапе развития общества, представлен методический опыт работы по использованию средств повышения адаптированности обучаемых и специалистов разных категорий.

Материалы сборника предназначены научным коллективам, преподавателям средних и высших учебных заведений, аспирантам, студентам.

**УДК 371.13 (043.2)**
**ББК 74р**

**ISBN 985-6616-33-6**
**ISBN 985-6616-34-4 (Часть 1)**

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2003

Репозиторий БарГУ

# АДАПТАЦЫЯ ВЫНІКАЎ МАСТАЦКАГА ПАЗНАННЯ ДА МЭТЫ ФАРМІРАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ СВЯДОМАСЦІ АСОБЫ

**А.І. Белая**

Беларусь, г. Баранавічы

Мастацкая літаратура – адметны сродак фарміравання асобы сучаснага студэнта, паколькі мастацкая патрэбнасць уваходзіць у структуру важнейшых патрэбнасцей чалавека. Яна выяўляецца ў разнастайных формах, аднак заўсёды ўключае ў сябе памкненне да ўзвышаных пачуццяў, розуму і годнасці, да самаўдасканалення асобы. Нягледзячы на разнастайнасць мастацкіх культур і змену мастацкіх напрамкаў, літаратура як мастацтва заставалася нязменным сродкам фарміравання гуманістычных прынцыпаў і каштоўных арыентацый.

Развіццё асобы ў працэсе ўспрымання твораў літаратуры мае на ўвазе не толькі непарыўнае ўзбагачэнне ведаў чалавека пра навакольны свет, а і фарміраванне адпаведных якасцей яго асобы, пабудову цэласнай сістэмы паводзін. Прычым набыццё новых звычак, асіміляцыя поглядаў, узнікненне новых утварэнняў у структуры асобы чытача пад уплывам створаных літаратурай тыпаў адбываецца паступова, непрыкметна.

Вобразы і ўяўленні аб людзях, якія фарміруюцца пры ўспрыманні іх мастацкага адлюстравання, удзельнічаюць у рэгуляцыі паводзін чалавека. Мастацкае пазнанне, такім чынам, з'яўляецца крыніцай перманентнага ўзбагачэння маральных паняццяў і

ўяўленняў, фарміравання эталонаў паводзін, яскравых крытэрыяў вызначэння маральнай важкасці таго ці іншага ўчынку, яго адпаведнасці маральным каштоўнасцям, маральнаму ідэалу.

Мастацкая літаратура дае чалавеку магчымасць, пазнаючы іншых, засвойваць пэўныя сацыяльна выпрацаваныя каштоўнасці, "ствараць" сябе адпаведна зададзенай мастацкай мадэлі. Вобразы станоўчых герояў выступаюць у якасці ўзораў для пераймання, непасрэдных "мадэляў сацыяльнага дзеяння" [3]. Гэта ў пэўнай меры датычыць і працэсу культурнай самаідэнтыфікацыі на грамадскім і індывідуальным узроўні, якая ёсць не што іншае, як нацыянальная свядомасць. У ёй, як і ў кожнай форме грамадскай свядомасці, выдзяляюцца элементы патрыятычнай свядомасці. Адной з дамінант патрыятычнай свядомасці з'яўляюцца адносіны да экалагічнай сферы Радзімы, якія праяўляюцца ў паказчыках, што сведчаць аб пазіцыі і практычнай дзейнасці сацыяльнага суб'екта адносна роднай прыроды [1]. Індыкатарамі выступаюць адпаведныя веды і ўстаноўкі. Свядомае мысленне, свядомыя экалагічныя паводзіны можна сфарміраваць толькі пры ўмове змянення прыродаспажывецкай псіхалогіі, якая пануе зараз, на прыродазберагальную. Даволі глыбокую даўніну маюць традыцыі добрых узаемаадносін нашых продкаў з прыродным наваколлем. У беларускім нацыянальным характары моцныя пачаткі альтруізму, любові да людзей, жывёл, раслін, а светапогляд першапачаткова абумоўліваўся пантэізмам, па глыбіні якога беларусы стаяць найбліжэй да асобных народаў Усходу (Індыі, Кітая, Японіі).

Адзін з сучасных праектаў сістэмы нацыянальнага ўладкавання мае на ўвазе "адраджэнне шматвяковай культуры, якая абараняе нас ад памылак навукова-тэхнічнага прагрэсу, адраджэнне нацыянальнага вопыту ашчаднага прыродакарыстання", дзеля чаго патрабуецца як навучанне неабходным ведам, так і адпаведнае выхаванне духоўнасці [2]. Немагчыма вывучэнне культурнай спадчыны народа ў адрыве ад прыроды, якая са старажытнасці натхняла майстроў слова на творчасць і акружае нас зараз.

Спецыфіка прыроды Беларусі з яе разнастайнасцю ландшафтаў, кліматычных зон, даволі багатай флорай і фаўнай аказвала значны ўплыў на фарміраванне беларускай ментальнасці. Прыгажосць беларускай прыроды выпрацоўвала ў нашых продкаў развітае эстэтычнае пачуццё, уменне бачыць і адчуваць хараство навакольнага асяроддзя. Таямнічы шум неабсяжных лясоў і бароў, загадкава-жахлівыя балоты, вялікія і малыя рэкі і азёры (невыпадкова ў беларускім фальклоры найчасцей згадваюцца такія архетыпы, як



Репозиторий БарГУ

лес, балота, поле) з цягам часу сфарміравалі ў беларусаў надзвычай багатую і дзіўную фантазію, развітую ўражлівасць, некаторую містычнасць светаўспрымання, схільнасць да абагаўлення неспасцігальных сіл прыроды.

Упершыню ва ўвесь голас пра гэтыя якасці беларускага нацыянальнага характару абвясціў Мікола Гусоўскі ў "Песні пра зубра".

"Адкрыў свету Беларусь" як край "тужлівы і змрочны, але чароўны" Ян Баршчэўскі ў творы "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях".

Творчасць паэтаў-лацiністаў і беларуска-польскіх пісьменнікаў – наступная пасля фальклору ступень "эмацыянальнага абуджэння розуму" (В.А. Сухамлінскі) у напрамку фарміравання экалагічнай свядомасці вучнёўскай і студэнцкай моладзі.

Асэнсаванне ідэі мастацкага твора вызначаецца характарам яго першапачатковага ўспрымання, якое падрыхтоўваецца настаўнікам; якасцю вобразнага ўяўлення і багаццем асацыяцый. Першапачатковая задача ў навучанні літаратуры – фарміраванне здольнасці ўспрымання рэчаіснасці па законах прыгажосці, усведамленне прыроды ў якасці эстэтычнага аб'екта. Калі зыходзіць з таго, што рэчаіснасць прысутнічае ў літаратурным творы як свет – метафара, то найбольш метафарызаваны свет прыроды ў беларускай паэзіі. Аднак адносіны вучань (студэнт)–пейзаж ніколі не былі "бясхмарнымі", асабліва ў тым выпадку, калі суб'ект навучання – гараджанін. Педагагічнае майстэрства настаўніка найперш павінна быць скіравана на спосабы метадычнай інтэрпрэтацыі пейзажнай лірыкі па законах творчасці, вынікам якой з'явіцца асобаснае "прысваенне" сэнсу твора.

Акрамя адчування слова, неабходна абуджаць у вучняў (студэнтаў) здольнасць да эмпатыі, спасціжэння эмацыянальнага стану герояў твора. У акрэсленым намі напрамку важкі выхаваўчы эфект мае даследаванне ідэйнага зместу вобразаў герояў паэмы Якуба Коласа "Новая зямля". Іх штодзённае жыццё – увасабленне адмысловага "прыродна-каляндарнага" напрамку ментальнасці беларусаў, "каляндарнага модусу" мыслення. Прырода ў "Новай зямлі" – дзеючая асоба, дзейсная гераіня, эстэтычны аб'ект, а таксама асноватворны аб'ект дачынення і адказнасці. Прычым не толькі ў прагматычных гаспадарча-эканамічных адносінах, а і ў грунтоўным філасофскім асэнсаванні. Асабліва гэта датычыць яе "структурнага кампанента" – зямлі, паняцця, якое тлумачыцца ў творы не толькі і не столькі як глеба, а, з'яўляючыся ў першую чаргу топасам,



Рэпазіторый БарДУ

адначасова выступае і сімвалам свабоды, годнасці, увасабленнем агульначалавечага зместу паняцця "ўласнасць". Пры асваенні зместу твора належнае месца варта адвесці пашыраючым і развіваючым пытанням, стварэнню і вырашэнню праблемных сітуацый, у т.л. палягаючых у сферы ўнутрыпрадметных і міжпрадметных сувязей на ўзроўні асацыяцый, суаднясення, супастаўлення, параўнання. Важная роля ў працэсе фарміравання свядомасці належыць творчым працам вучняў.

Вучнёўскія сачыненні – гэта свайго рода праекцыя будучага маральнага дзеяння. Праз гэты від дзейнасці ў працэсе школьнага навучання ў пэўнай ступені рэалізуецца канатыўны аспект свядомасці, у нашым выпадку экалагічнай. Адным з відаў творчых работ з'яўляецца дамысліванне, якое патрабуе далікатных да сябе адносін: захавання аўтарскай логікі характараў і сюжэтных ліній і суаднясення іх з канкрэтным грамадска-палітычным кантэкстам. Удалай нам здаецца спроба ўявіць сабе далейшы лёс нашчадкаў Міхала ("Новая зямля"), тым больш што гэтая праца патрабуе прыцягнення і міжсістэмных асацыяцый. Немалаважным у аспекце акрэсленай праблемы з'яўляецца тое, што ў працэсе яе выканання аўтары "прымяраюць на сябе" разнастайныя сацыяльныя ролі, пасродкам якіх рэалізуюцца згаданыя вышэй адносіны дачынення да аб'ектаў прыроды і адказнасці за іх.

Паняцце "экалогія" ўжываецца ў наступных значэннях:

1. Раздзел біялогіі, які вывучае ўзаемадзеянне раслінных і жывёльных арганізмаў паміж сабой і з навакольным асяроддзем.

2. Стан навакольнага асяроддзя, які склаўся ў выніку безгаспадарчага выкарыстання прыродных рэсурсаў і пагражае існаванню людзей.

Зараз, на жаль, прыярытэт ужывання належыць другому значэнню. Экалагічная тэма ў літаратуры – гэта перш за ўсё чарнобыльская.

Мінуў час, калі надзённай тэмай кашчунна спекулявалі, і танны эфект выкрывальніка ўжо перастаў уражваць уяўленне. Шлях асваення гэтай тэмы – глыбокі, асэнсаваны, мужны пошук ісціны, які вядуць разам дарослыя і моладзь. Прыгажосць – і небяспека, радасць і боль, жыватворная вільгаць – і смерць. Такая, у прыватнасці, трагічная эвалюцыя архетыповага ў беларускай паэзіі XIX–XX стст. вобраза хмаркі. Яшчэ вастрэй падобныя пытанні ўзнімаюцца пасля вывучэння "Палескай хронікі" Івана Мележа:

Пудка шапоча на ветры аер,
Спее атрута ў зямным умалоце…



Репозиторий БарГУ

Як вам жывецца на свеце цяпер,
Людзі мае, на палескім балоце?..

Гэтыя радкі з верша Міколы Мятліцкага становяцца эпіграфам да ўрока-разважання аб лёсах нашчадкаў мележаўскіх Васіля і Ганны, лёсе шматпакутнай прыроды Палесся, вытоках трагедыі народа, якая адыходзіць сваім карэннем у гады "вялікага пералому".

У мастацкім творы аб'ектам даследавання заўсёды з'яўляецца аўтарская пазіцыя. Каб яе правільна вызначыць, важна засвоіць, у чым адметнасць асобы пісьменніка. Так, у прыватнасці, пры знаёмстве з біяграфіяй У. Караткевіча неабходна адзначыць, што ён – не толькі самабытны талент, але і энцыклапедыст па сваіх ведах, эрудыцыі, вандроўнік, палымяны і дзейсны патрыёт, цікаўны да людзей, прыроды і гісторыі. Ён першы ў Беларусі пачаў біць трывогу, прадбачачы экалагічныя крызісы. Добра ведаючы нашы лясы і рэкі, заклікаў да іх разумнага, гаспадарскага выкарыстання.

У свой час сітуацыю, апісаную паэтам у вершы "Дзяўчына пад дажджом" (другая палова 60-х), можна было лічыць надуманай і фантастычнай: беларуская дзяўчына выбегла пад сонечны дождж, цешыцца, радуецца сонечным промням:

Бэзам з садоў павявала, вечна хацелася жыць.
Дзяўчына ад шчасця спявала.
Стронцый быў у дажджы.

Яна не адчувала і нават уявіць не магла, што гэты дождж зусім не ласкавы, а яе радасць ужо азмрочана подыхам смерці. Мінуў час, і мы пераканаліся ў жахлівасці прадбачанага паэтам.

Як зусім справядліва адзначыла крытык Вера Палтаран, У. Караткевіч – гэта "пасыльны службы часу, які нястомна шукаў "времен связующую нить", каб зберагчы чалавечую душу ад духоўнай эрозіі, каб паразумець людзей, з'яднаць іх высокай мэтай добраўпарадкавання свету". Улічваючы тое, што нашы навучэнцы ў хуткім часе самі стануць настаўнікамі і выхавацелямі, варта звярнуць іх увагу на тое, што У. Караткевіч – аўтар шэрагу літаратурных казак, у якіх сярод іншых маральна-этычных праблем узнімае і праблему адносін чалавека да ўсяго жывога, да агульнага нашага дому-Зямлі, на якой ёсць што ахоўваць.

Сёння ў беларускай літаратуры загучалі новыя імёны, якія ўвасабляюць працяг лепшых традыцый творчасці У. Караткевіча. У прыватнасці, гэта насычанасць твораў сучаснай маральнай праблематыкай і паэтычнае даследаванне такіх яе значных аспектаў, як мараль і чалавек ва ўмовах НТР, мараль і барацьба за захаванне свету ад ядзернай катастрофы, чалавек–мараль–экалогія. Выбух на



Репозиторий БарГУ

Чарнобыльскай АЭС быў горкай прычынай з'яўлення ў нашай сучаснай літаратуры новай тэмы. І, бадай, першым, самым значным творам, у якім яна асэнсоўваецца, з'явілася паэма Сяргея Законнікава "Чорная быль". Шмат усхваляваных пытанняў гучыць са старонак твора. І кожны павінен сумленна адказаць на іх. Адказаць, у першую чаргу, сабе, бо "толькі ўласнае сумленне – і першы, і адзіны бог".

Распрацоўваючы заняткі па экалагічнай тэме ў курсе "Сучасная беларуская літаратура", цяжка абысці ўвагай цыкл карцін М. Савіцкага "Чорны боль". Гэта споведзь мастака, своеасаблівы дакумент эпохі. Сутнасць жывапісу – трагічнае. Дастаткова параўнаць работы Савіцкага "Партызанская мадонна" і "Чарнобыльская мадонна", каб зразумець, якая вайна яшчэ пакідае нейкія надзеі на працяг жыцця. А якая – не…

Без суперажывання трагедыі немагчыма выхаваць у людзей усведамленне дачынення да агульнага быцця, асабістай адказнасці за тое, што адбываецца, імкненне да творчага ўдзелу ў стварэнні свету.

Але разам з тым важна, каб трагічнае не прывяло да настрою безвыходнасці, асуджанасці, таму важна даць пачуць нашым выхаванцам, што у "Рэквіеме" заўсёды (і ў прыватнасці, ў Моцартавым) гучаць не толькі жалобныя, але і жыццесцвярджальныя матывы, што ён не пахавальны марш.

Па-мастацку асэнсоўваючы сутнасць габальных праблем сучаснасці, пісьменнікі, мастакі, кампазітары перасцерагаюць усіх нас, заклікаюць памятаць, што прыручаць і эксплуатаваць прыроду трэба асцярожна, з розумам, цярпеннем, любоўю.

Эмацыянальнае заражэнне, эмпатыя, рэфлексія, выкліканыя дэманстрацыяй твораў жывапісу, узмацняюцца ў працэсе параўнання выяўленчых сродкаў карціны "Чарнобыльская мадонна" і верша Галіны Варатынскай "Ля карціны М. Савіцкага "Чарнобыльская мадонна".

Дзеля нашай будучыні мы павінны кіравацца спрадвечнымі этычнымі законамі, сфармуляванымі ў літаратуры пасродкам эстэтычных катэгорый прыгожага, узвышанага, трагічнага: "не рабіць другому тое, што табе не міла; браць у прыроды не больш, чым яна здольная аднавіць; усё рабіць прыгожа, з душою; перадаць нашчадкам родны кут лепшым, чым атрымаў яго сам" [3].

**Літаратура**

1. Барадзіна А.І. Фарміраванне гісторыка-патрыятычнай свядомасці школьнікаў пры вывучэнні літаратуры (на матэрыяле твораў У. Караткевіча). Дыс. … канд. пед. навук.– Мн., 2000.

2. Мікуліч А., Церахаў Я. Праз экалагічную свядомасць да народнай згоды // Літаратура і мастацтва.– 1998.– № 3.

3. Рожина Л.Н. Художественное познание и нравственное воспитание личности / Шляхі ўдасканалення літаратурнай адукацыі: Матэрыялы. рэсп. нав.-практ. канф.– Мн., 1992.

Репозиторий БарГУ